З ухілам на якасць

ПРАЗРЫСТАЯ АДЗНАКА

— Тое, што ЦЭ і ЦТ адбываюцца ў адзін дзень, вельмі добра, — адзначае Дзяніс Дук. — Гэта здымае цэлы шэраг арганізацыйных пытанняў, у тым ліку і фінансавых, бо ўсё праводзіцца за кошт бюджэтных сродкаў. Заадно стымулюе актыўна рыхтавацца абітурыентаў, якія даўно скончылі школу, а таксама выпускнікоў каледжаў, якія ўжо ў маі павінны праходзіць вышэйазначаныя іспыты, і школьнікаў, якія добра ведаюць, што замест некалькіх школьных экзаменаў ім трэба здаць толькі два цэнтралізаваныя. Гэта аб'ектыўны фактар. Калі, умоўна кажучы, у атэстаце «8», а ЦЭ здадзена на «4», напэўна, нешта ў сістэме ацэньвання ў школе не працуе. Гэта бачыць і выкладчык, і абітурыент. Але па вопыце мінулага года карэляцыя не вельмі вялікая, значыць, адзнакі ў школе аб'ектыўныя. Гэта вельмі станоўчы вынік і стымул добра вучыцца для дзяцей.

Яшчэ адной навацыяй гэтага года з'яўляецца большая гнуткасць пры залічэнні абітурыента ў вышэйшую навучальную ўстанову. Можна паступіць у рэгіянальныя ВНУ па выніках універсітэцкіх алімпіяд. Па-за межамі конкурсу таксама пераможцы абласнога этапу алімпіяд, па выніках сумоўя паступаюць выпускнікі профільных класаў, плюс — мэтавая падрыхтоўка. Калі ласка, па мэтавым накіраванні здавай адзін экзамен замест трох і атрымлівай студэнцкі білет і залікоўку. Калі чалавек мае намер паступіць у ВНУ, ён абавязкова паступіць. Праўда, для гэтага трэба будзе прыкласці пэўныя намаганні. Ёсць спецыяльнасці інжынернага плана, педагагічнага, на што цяпер нацэлена падрыхтоўка ў профільных класах. Мы разлічваем, што больш за палову вучняў профільных класаў па педагагічнай скіраванасці Магілёўшчыны пойдзе ў наш дзяржуніверсітэт. У наступным годзе магчымасць паступаць на інжынерныя спецыяльнасці з'явіцца ў выпускнікоў інжынерных класаў. Сістэма адукацыі гнуткая, прыстасоўваецца да запытаў часу, дае абітурыентам больш магчымасцяў.

— Некалькі месяцаў таму, калі Прэзідэнт размаўляў з рэктарамі ВНУ, ён завастраў увагу на праблемах вышэйшай адукацыі. Былі пытанні і наконт празрыстасці ЦТ.

— Вопыт мінулага года, калі паступілі скаргі, што падчас ЦТ няма празрыстасці, улічаны. Цяпер усе бланкі адказаў будуць персанальна высланы абітурыенту. Ён будзе бачыць, дзе адказаў правільна, а дзе памыліўся. Раней такога не было.

— Магчыма, нешта будзе ўдасканалена і ў адносінах замацавання выпускнікоў на першым працоўным месцы? Гэта пытанне таксама застаецца праблемным.

— Гэта праблема не толькі ВНУ, ёсць яшчэ і работадавец. Універсітэт накіроўвае на работу строга ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Работадавец жа павінен забяспечыць умовы, каб маладому спецыялісту захацелася застацца на першым працоўным месцы. Па-першае, гэта камфортны клімат у калектыве, па-другое, павінен быць інстытут настаўніцтва, каб малады чалавек ведаў, да каго звярнуцца па параду, па-трэцяе, важны аспект — матэрыяльнае стымуляванне працы, па-чацвёртае, стварэнне бытавых умоў для пражывання. Калі няма жылля і перспектыў яго атрымаць, малады чалавек не затрымаецца на працоўным месцы. Гэтую праблему ведаюць у вобласці. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама неаднаразова звяртаў на яе ўвагу і казаў, што яна комплексная і кіраўніцтва на месцах павінна клапаціцца пра ўмовы працы і жылля для маладых спецыялістаў. Калі ўсё гэта супадае і мы бачым, што ўсе кампаненты разам, малады чалавек абавязкова застанецца і нават створыць сям'ю. На працягу двух гадоў мы адсочваем, як наш выпускнік працуе, які ў яго заробак. Ён павінен працаваць на поўную стаўку і па профілі. Калі мы выяўляем парушэнні, накіроўваем ліст да работадаўца і просім выправіць хібы. Потым паўторна робім запыт. Калі сітуацыя не мяняецца, накіроўваем звесткі ў пракуратуру, якая дае прававую ацэнку такіх дзеянняў на месцы. Але гэта бывае вельмі рэдка.

У АДПАВЕДНАСЦІ З ПАТРАБАВАННЯМІ ЧАСУ

— Ваша ВНУ рыхтуе ў тым ліку і журналістаў. На нядаўнім медыяфоруме ў Магілёве Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што гэта вельмі адказная прафесія, у сучасных умовах нечым падобная на ваенную. Словазлучэнне «інфармацыйныя войны» само за сябе кажа.

— Так. Гэта вельмі адказная прафесія, і мы ганарымся, што нашы выпускнікі трымаюць планку. Наогул, зварот Прэзідэнта быў вельмі шчырым, насычаным пазітыўнымі эмоцыямі. Як заўсёды, былі зроблены акцэнты, расстаўлены прыярытэты, на што больш звярнуць увагу. Вельмі спадабалася тая цеплыня, з якой ён звяртаўся да журналістаў, ступень паглыбленасці ў вырашэнне праблемы. Сёння дробных тэм не бывае. Рэгіянальныя СМІ падхопліваюць тое, што турбуе людзей на месцы. Прэзідэнт адзначыў іх высокую ролю. Што яны, нягледзячы на стварэнне медыяхолдынгаў, павінны заставацца мясцовымі выданнямі і не губляць сваёй асаблівасці. Паказваць праблемы і як яны вырашаюцца ўладамі. А калі праблема вырашана, трэба напісаць і пра вынік. Па сабе і сваёй сям'і ведаю, што жывыя матэрыялы з месцаў выклікаюць вялікі інтарэс. Той куточак, дзе жывеш, бліжэйшы за ўсё. І я згодны з тым, што роля рэгіянальных СМІ вялікая. Шмат нашых выпускнікоў працуюць у розных масмедыя, пачынаючы ад тэлеканала Беларусь 4 (Магілёў), заканчваючы рэдакцыямі розных газет. І шмат хто сябе добра зарэкамендаваў. У нас студэнты працуюць ужо з 3-га курса. Ёсць свая газета і ў ВНУ, дзе студэнты практыкуюцца ў розных тэхнічных спосабах данясення інфармацыі, апрацоўкі фота, відэа.

— Універсітэт імя А. Кулешова сёння рыхтуе педагогаў, юрыстаў, журналістаў і іншых спецыялістаў. Сёлета, наколькі ведаю, будзе адбывацца набор і на новыя спецыяльнасці?

— У гэтым годзе мы адкрылі набор на спецыяльнасць «Трэнерская праца» з кваліфікацыяй не настаўнік фізічнай культуры, а менавіта трэнер па лёгкай атлетыцы. Яна больш складаная ў плане падрыхтоўкі, але вельмі запатрабаваная ў рэгіёне. Удзячны ўпраўленню спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама, кіраўніцтву вобласці і Міністэрству адукацыі за вялікую працу дзеля таго, каб гэтая спецыяльнасць у рэгіёне з'явілася. Трэба было даказаць Міністэрству спорта, што ў нашым універсітэце і наогул Магілёўскай вобласці створаны ўсе ўмовы для якаснай падрыхтоўкі трэнераў. Мы ўдасканальваем нашу матэрыяльную базу, будуем новы шматфункцыянальны стадыён, які будзе, напэўна, адным з самых сучасных у Магілёве. Спадзяёмся, што будаўніцтва завершыцца ўжо сёлета. Мы паказалі магчымасці Магілёва, на базе якіх устаноў зможам праводзіць навучанне трэнераў па лёгкай атлетыцы. За апошнія гады ў Магілёве з дапамогай рэспубліканскага бюджэту зроблена шмат новых аб'ектаў для падрыхтоўкі спартсменаў, якія, як ацанілі спецыялісты, адпавядаюць патрабаванням. Гэта была першая ўмова для адкрыцця спецыяльнасці ў ВНУ. Другая — наяўнасць высокакваліфікаваных кадраў. Добрага трэнера можа падрыхтаваць толькі выдатны трэнер. Ва ўніверсітэце працуе некалькі чалавек, якія маюць кваліфікацыю трэнера і падрыхтавалі шмат чэмпіёнаў рознага ўзроўню. Плюс мы звярнуліся да мясцовых федэрацый, і нам гарантавалі для ўдзелу ў навучальным працэсе вядучых трэнераў, якія таксама падрыхтавалі не аднаго чэмпіёна Беларусі, свету.

Сёлета ў рамках нашай традыцыйнай спецыяльнасці «Адукацыя ў галіне фізічнай культуры» мы адкрылі таксама новую спецыялізацыю «Пачатковая ваенная падрыхтоўка». Акрамя кампетэнцыі настаўніка фізічнай культуры будучы спецыяліст будзе валодаць неабходнымі ведамі па пачатковай ваеннай падрыхтоўцы, што сёння вельмі запатрабавана ў школах. Гэта пашырыць магчымасці ў прафесійным плане. Плюс мы спадзяёмся і ўжо зрабілі ўсе неабходныя крокі, каб з другога курса пэўная частка студэнтаў, якія абяруць гэтую спецыялізацыю, навучалася на ваеннай кафедры Беларуска-Расійскага ўніверсітэта і на выхадзе атрымлівала лейтэнанцкія пагоны. У нас з Міністэрствам адукацыі ёсць папярэдняя дамоўленасць аб адкрыцці ў 2025 годзе новай спецыяльнасці, каб з самага пачатку наш спецыяліст абазначаўся як выкладчык пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, а потым ужо фізічнай культуры. І спадзяюся, што налета аб'явім набор ужо на спецыяльнасць «Пачатковая ваенная падрыхтоўка», а не на спецыялізацыю як цяпер.

— На якія спецыяльнасці прагназуецца найбольш вялікі попыт?

— Думаю, будзе, як заўсёды, карыстацца попытам шэраг педагагічных спецыяльнасцяў: пачатковая адукацыя, у тым ліку інклюзіўная, правазнаўства, ІТ-спецыяльнасці. Абітурыенты актыўна цікавяцца згаданай спецыялізацыяй «Пачатковая ваенная падрыхтоўка». Пытаюцца пра магчымасць навучання на ваеннай кафедры, кваліфікацыю будучага выкладчыка, цікавяцца прахаднымі баламі, як паступіць па мэтавым наборы.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

— Сёлета ва ўніверсітэцкай праграме з'явіліся новыя дысцыпліны, якія датычацца ідэалагічнага складніка. Раскажыце пра іх.

— Тэма ідэалагічнай накіраванасці знаходзіцца ў зоне пільнай увагі і пастаянна абнаўляецца. Нашы новыя дысцыпліны — гэта «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», разам з традыцыйнымі дысцыплінамі, такімі як «Філасофія». «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» — гэта сінкрэтычная дысцыпліна, якая паказвае, які шлях адолелі нашы інстытуты ўлады, каб прыйсці да моцнай прэзідэнцкай рэспублікі, у чым перавагі гэтай формы кіравання, адметнасць нашых дзяржаўных сімвалаў, чым мы ганарымся.

За нашымі сімваламі шматвяковая гісторыя, хоць апаненты спрабуюць пярэчыць. Але факты — рэч упартая. Дысцыпліна вельмі цікавая, шматаспектная, яна падводзіць да разумення, што мы жывём у краіне, дзе кожная эпоха наклала свой адбітак на тое, якімі мы сталі і куды нам рухацца далей. Каб усе ведалі, чаму на нашай глебе не могуць прыжыцца тыя заходнія ліберальныя каштоўнасці. У нас яны традыцыйныя, далёкія ад скажэнняў, якія назіраем у Заходняй Еўропе. Мы — традыцыйнае грамадства з традыцыйнымі сямейнымі каштоўнасцямі. Яны пабудаваны на павазе да старэйшых, на роўных і ўзаемапаважлівых узаемаадносінах паміж мужчынам і жанчынай.

Другі прадмет, які абавязковы для ўсіх, — «Сучасная палітэканомія». Па абедзвюх дысцыплінах ёсць падручнікі, я з'яўляюся адным з аўтараў «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці». Новыя дысцыпліны — жывы матэрыял. На яго аснове можна рабіць вучэбна-метадычныя комплексы ці дапаможнікі. Ніхто не абмяжоўвае. І гэты сацыяльна-гуманітарны блок пастаянна абнаўляецца. Падручнікі выйшлі летась, і там пакуль нічога няма пра апошнія выбары ў парламент, новы фармат УНС. Усё гэта ў найбліжэйшай будучыні таксама павінна легчы на старонкі падручнікаў.

МІЖНАРОДНЫЯ СТАСУНКІ

— Напярэдадні Форум рэгіёнаў. Як у ім будзе задзейнічаны ваш універсітэт?

— У нас традыцыйна падчас яго працуе форум рэктараў Беларусі і Расіі. Мы падпісваем дагаворы з ВНУ-партнёрамі з Расійскай Федэрацыі або мадэрнізуем тыя, што ўжо былі, або падпісваем пагадненні аб нейкіх новых сумесных праектах. Тут вельмі шмат аспектаў. Як прыклад, мы актыўна ўдзельнічаем у Асацыяцыі педагагічных універсітэтаў па лініі СНД. З Узбекістанам ёсць сумесныя адукацыйныя праграмы, з расійскімі партнёрамі кожны раз знаходзім новыя пункты ўзаемадзеяння. Сёння рыхтуем свае прапановы да нашых партнёраў і, калі яны будуць падтрыманы, у чэрвені падпішам дамоўленасці.

— У вас праходзяць навучанне студэнты з розных краін, у тым ліку афрыканскіх. Якія спецыяльнасці яны выбіраюць і як гэта супрацоўніцтва развіваецца?

— Экспарт адукацыйных паслуг — гэта адна з асноўных сфер у дзейнасці ўніверсітэта. Да нас прыязджаюць на падрыхтоўчыя курсы для паступлення ў розныя ВНУ Беларусі, у тым ліку і нашу, прадстаўнікі болей чым 10 краін Афрыкі. Адзін з нашых галоўных традыцыйных партнёраў — гэта Кітай. Тут мы бачым вельмі высокую запатрабаванасць на нашу адукацыю, асабліва магістарскую падрыхтоўку, аспірантуру. І трэці кірунак — краіны Азіі з былога Савецкага Саюза, такія як Узбекістан, Туркменістан, Таджыкістан, дзе таксама ёсць вялікі попыт на нашу адукацыю. Для ўзбекскіх студэнтаў навучанне вядзецца на рускай мове, для кітайскіх — у асноўным на англійскай. На сёння наш асноўны ўзбекскі партнёр — універсітэт горада Чырчык. Іх студэнты вучацца дома тры гады па нашых адукацыйных праграмах, а потым прыязджаюць у Магілёў. Замежныя студэнты атрымліваюць у нас веды па педагагічных спецыяльнасцях па кірунках біялогіі, фізікі, матэматыкі, пачатковай адукацыі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Дзяніса ДУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарожнае будаўніцтва

Разметка пераходзіць на пластык, а ў сталіцы ўстанаўліваюць «моцныя» прыпынкі

Да першых дзён лета дарожнікі ўжо шмат чаго зрабілі. І, напрыклад, аб'ёмы рамонту дарог у Мінску сёлета не знізяцца ў адносінах да ўзроўню мінулага года.

Пра гэта расказаў **генеральны дырэктар ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Максім БЕЛАВУС.** Ён адзначыў, што ў Мінску ў бягучым годзе плануецца рамонт не менш за 1,3 мільёна квадратных метраў асфальтабетоннага пакрыцця, уключаючы работы па яго поўнай замене, бягучым ямачным рамонце і герметызацыі швоў. Аднак улічваючы, што плануецца дадатковае выдзяленне сродкаў у канцы другога — пачатку трэцяга квартала, то гэта аб'яднанне зможа па выніках года выйсці на лічбу, не ніжэйшую за леташнюю. У 2023 годзе ў Мінску было адрамантавана 1,8 мільёна квадратных метраў дарог. Максім Белавус таксама падкрэсліў, што будуць павялічаны аб'ёмы работ па герметызацыі швоў у бягучым годзе.

«Што датычыцца адрасоў, то, напрыклад, будзем прыводзіць у парадак перыметр вуліц, прылеглых да нацыянальнага футбольнага стадыёна і басейна міжнароднага ўзроўню па вуліцы Кальварыйскай, як у рамках будаўніцтва гэтых аб'ектаў, так і нашай бягучай дзейнасці», — расказаў Максім Белавус.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Сур'ёзныя канструкцыі з антывандальным шклом

Часам на гарачыя лініі сталічных начальнікаў паступаюць званкі ад жыхароў горада з нараканнямі наконт якасці канструкцый прыпыначных пунктаў. У некаторых месцах яны мяняюцца амаль кожны год, а ў іншых раёнах галоўнага мегаполіса амаль што рассыпаюцца, скардзяцца жыхары. Так, сапраўды, у некаторых месцах рамонт або замена прыпынкаў робіцца па прычыне вялікай паруснасці ў дадзенай мясцовасці. Але гэта, хутчэй, выключэнне, а не правіла.

Максім Белавус адзначыў, што замена прыпынкаў праводзіцца планава, з улікам тэрмінаў службы гэтых аб'ектаў. У 2024 годзе з 1953 павільёнаў у горадзе плануецца замяніць 175 аб'ектаў, што ў паўтара разы больш, чым летась, і ў 10 разоў больш, чым у 2022 годзе. Гэта вялікая праграма, у рамках якой каля 15—17 прыпынкаў будзе заменена ў кожным раёне Мінска.

Ён таксама адзначыў высокую якасць новых аб'ектаў. «Іх знешні выгляд зацверджаны Мінгарвыканкамам, распрацаваны з ужываннем тоўстага металічнага профілю, яны ацынкаваныя, пакрытыя палімерам, маюць антывандальнае таніраванае шкло. З трох бакоў на павільён нанесена найменне прыпынку на рускай і беларускай мовах. Гэта надзейныя канструкцыі, у якіх усё пралічана нават з улікам ветравых нагрузак. Метады ўстаноўкі падмуркаў і бетанавання таксама будуць прымяняцца іншыя», — расказаў ён.

Тэмпы замены прыпыначных павільёнаў у горадзе зніжаць не плануюць. «Будзем штогод мяняць не менш за 200 штук павільёнаў, што дазволіць за 5-6 гадоў ліквідаваць прыпынкі, якія па тэрміне службы прызнаны аварыйнымі», — адзначыў ён.

Дырэктар таксама адзначыў, што для падтрымання парадку ў частцы вулічна-дарожнай сеткі горада тут імкнуцца адыходзіць ад ямачнага рамонту, выконваючы работы комплексна, змяняючы пакрыццё на ўсю шырыню вуліцы. «У любым выпадку дарогі ў горадзе становяцца лепшымі», — падкрэсліў спецыяліст.

Сыходзіць ад звычайнай фарбы

Пра тое, што пры нанясенні дарожнай разметкі будуць паступова пераходзіць ад эмаляў да пластыку халоднага і гарачага нанясення, расказаў **дырэктар КУП «СМЭП Мінгарвыканкама» Вячаслаў САВІЧ.** Эксперт адзначыў: штогод з надыходам спрыяльнага надвор'я для стварэння камфортных умоў для ўдзельнікаў дарожнага руху, павышэння прывабнасці вулічна-дарожнай сеткі спецыялісты прадпрыемства выконваюць комплекс работ па абнаўленні дарожнай разметкі. Запланаваны аб'ём на гэты год складае 350 тысяч квадратных метраў, з іх ужо выканана каля 254 тысячы квадратных метраў, што складае больш за 60 % ад усяго, што трэба зрабіць.

Сёлета арганізацыя плануе значна павялічыць аб'ёмы нанясення разметкі з ужываннем высакаякасных і даўгавечных матэрыялаў. Маюцца на ўвазе такія пакрыцці, як пластыкі халоднага і гарачага нанясення. «Іх вартасцямі з'яўляюцца добрая бачнасць, высокая зносаўстойлівасць, эканамічнасць нанясення і ўстойлівасць да рэагентаў», — расказаў Вячаслаў Савіч.

Перш за ўсё інавацыйныя матэрыялы для нанясення дарожнай разметкі будуць прымяняцца на абноўленых участках дарог. «Мы цалкам не адмаўляемся ад фарбы, аднак пастаянна вывучаем сусветны вопыт і разумеем, што будзем паступова сыходзіць ад выкарыстання эмаляў і пераходзіць на пластык», — падкрэсліў ён.

Рэспубліканскія дарогі цэнтральнага рэгіёна

У Мінскай вобласці на дарогах рэспубліканскага значэння сёлета заменяць больш за 300 кіламетраў пакрыцця. Пра гэта расказаў **начальнік упраўлення вытворчасці работ і ўтрымання дарожнай сеткі РУП «Мінскаўтадар-цэнтр» Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ.**

«Наша прадпрыемства абслугоўвае 3,4 тысячы кіламетраў рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, размешчаных у Мінскай вобласці. Асноўная іх частка, а гэта 3,2 тысячы кіламетраў, мае асфальтабетоннае пакрыццё і 203 кіламетры — цэментабетоннае. Ямачны рамонт на ўсіх участках дарог мы завяршылі да 9 мая», — адзначыў Дзмітрый Дземідовіч.

Ён таксама растлумачыў, што ямачнасць на дарогах утвараецца не толькі зімой, таму такая работа будзе працягвацца. Прычынамі ямачнасці з'яўляюцца як старэнне пакрыцця, так і ўздзеянне на палатно велікагрузных аўтамабіляў.

З пачатку года гэта прадпрыемства выканала ямачны рамонт на плошчы 76,8 тысячы квадратных метраў. Таксама будзе выкананы бягучы рамонт больш чым 300 кіламетраў пакрыцця (летась — 242 кіламетраў). Акрамя таго, у 2024 годзе неабходна аднавіць больш за 9 тысяч квадратных метраў ліній разметкі, з іх ужо выканана больш за 60 %. «Павелічэнне аб'ёмаў работ напрамую звязана з павелічэннем аб'ёмаў фінансавання», — дадаў Дзмітрый Дземідовіч.

Штодня працуюць да паўсотні брыгад

Як паведаміў **начальнік аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі руху КУП «Мінскаблдарбуд» Валянцін ВОЎЧАНКА**, на рамонце і абслугоўванні дарог мясцовага значэння працуюць дзясяткі брыгад. Дарогі мясцовага значэння не такія важныя, але іх нашмат больш. Працягласць гэтых дарог, якія абслугоўвае прадпрыемства «Мінскаблдарбуд», складае 16 тысяч кіламетраў, з якіх 8,5 тысячы кіламетраў маюць асфальтабетоннае і цэментабетоннае пакрыццё, 6,5 тысячы кіламетраў — гэта жвір і грунт. Летась структурнымі падраздзяленнямі прадпрыемства было ліквідавана 163 тысячы квадратных метраў ямачнасці, у гэтым — ужо 116 тысяч квадратных метраў. Работы былі выкананы да 1 мая. Аднак працэс стварэння ямачнасці не носіць сезонны характар, ён пастаянны, таму рамонтныя работы вядуцца і ў цяперашні час.

Ліквідуюць ямачнасць усімі даступнымі спосабамі. Таму штодня, уключаючы выхадныя дні, на дарогі выходзіць парадку 45—50 брыгад.

Таксама на мясцовых дарогах Мінскай вобласці ў бягучым годзе будзе абноўлена каля 5 тысяч кіламетраў гарызантальнай разметкі. «Каля тысячы кіламетраў ужо нанесена, але гэты працэс запавольвае адсутнасць уласнай базы разметачных аўтамабіляў. Згодна з заключанымі дагаворамі з прадпрыемствамі, якія аказваюць дадзеную паслугу, уся разметка па плане будзе нанесена да 1 верасня».

Валянцін Воўчанка адзначыў, што прадпрыемства КУП «Мінскаблдарбуд» займаецца рамонтам, утрыманнем і абслугоўваннем дарог Мінскай вобласці. У яго структуру ўваходзіць 23 ДРБУ, размешчаных у кожным раёне цэнтральнага рэгіёна.

На 7 пуцеправодах і мастах

У рамках бягучага рамонту ў гэтым сезоне ў сталіцы запланавана замена асфальтавага пакрыцця на сямі мастах і пуцеправодах. Агульная плошча рамонту складзе 16 тысяч квадратных метраў. Работы запланаваны на мастах праз Свіслач на вуліцах Кабушкіна, М. Багдановіча, пуцеправодах на вуліцы Сяліцкага над Партызанскім праспектам, на вуліцы Аранскай над вуліцай Трасцянецкай, на праспекце Дзяржынскага над вуліцай Алібегава, на скрыжаванні праспекта Незалежнасці і МКАД, на 31-м кіламетры МКАД на развязцы з вуліцай Шаранговіча.

Працягваецца капітальны рамонт пуцеправодаў паміж вуліцамі Маскоўскай і Чкалава, а таксама над чыгуначнай веткай Масква — Мінск на вуліцы Запарожскай. Акрамя таго, плануецца пачатак капрамонту пуцеправодаў на праспекце Жукава над вуліцай К. Лібкнехта, на вуліцы Даўгабродскай над вуліцай Ванеева і над чыгункай Масква — Мінск паміж вуліцай Маскоўскай і праспектам Незалежнасці.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

З цяплом, з дажджамі, ды яшчэ і з навальніцамі

Першая дэкада чэрвеня прынясе нам усе атрыбуты лета, але галоўнае — адагрэемся на славу, лічаць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Для пачатку ўспомнім, як у мінулыя выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны прайшлі кароткачасовыя навальнічныя дажджы рознай інтэнсіўнасці. Дарэчы, няўстойлівае надвор'е захаваецца ў нас і на гэтым тыдні, лічаць у Белгідрамеце.

А ў аўторак ноччу месцамі, а днём пераважна па паўднёвай палове рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі моцныя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 11—17 градусаў, а ўдзень — 22—28 цяпла.

Дзесьці падобнае надвор'е чакаецца і ў сераду, толькі тэмпература на пару градусаў ніжэй. У гэты дзень на большай частцы нашай тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, а ў дзённыя гадзіны месцамі моцныя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 9 градусаў па паўночным захадзе да 17 градусаў па паўднёвым усходзе, а днём — ад плюс 20 да 26 градусаў.

Хваля ападкаў пачне «высыхаць» ужо ў чацвер. У гэтыя суткі ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца ўжо кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы дасягне плюс 9—16 градусаў, а ўдзень — 20—27 градусаў.

А ноччу ў пятніцу да нас прыйдзе свежы халодны вецер. Праўда, ненадоўга. У гэты дзень надвор'е будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём па захадзе рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да плюс 7—14 градусаў, а ўдзень — да плюс 19—26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя інтэнсіўныя ападкі забудуць да нас дарогу, і зноў стане па-летняму цёпла і нават амаль горача. У суботу ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе плюс 9—15 градусаў, а днём павысіцца да плюс 21—28 градусаў.

У нядзелю ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Сіноптыкі ноччу абяцаюць ужо плюс 10—17 градусаў, а днём — 19—26 градусаў. Па паўднёвым усходзе тэмпература вырасце да 29 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.